Покліч Волі

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №6(77)
КРАСАВІК 2010 ГОДА

СЦЯГ КАЛЯ АДДЗЯЛЕННЯ БЕЛПОШТЫ

16 красавіка, прыблізна ў 17:30 каля галоўнага аддзялення Белпошты побач з плошчай Перамогі, група невядомых, якіх называюць сябе "Беларускія патрыёты" вывесіла нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг.

Сцяг на ліхтарным слупе пратрымаўся каля 30 хвілін, пасля чаго быў зняты асобамі ў цывільным. Шматлікія мінакі фатаграфавалі яго на мабільныя тэлефоны.

Ян Сведка.

ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ І ВЫБАРЫ

Здрабнела, канечне, сённяшняя ўлада ў параўнанні са сваімі папярэднікамі, не кажучы ўжо пра асновазаснавальнікаў. Тыя Гегеля пачытвалі, Кантам не грэбавалі, за перапіскай Энгельса з Каўцкім сачылі. Да таго ж залатое цяля папсавала нястойкія да абывацельскіх дабротаў душы сучаснай наменклатуры. Раней, за Саветамі, усе вялікія справы і здзяйсненні прымяркоўваліся да знамянальных датаў, а зараз, напрыклад, усе перабудовы пад еўра робяцца ў Віцебску да Славянскага базара. Толькі выбары ўлада, відаць, пад Чарнобыльскую катастрофу адмыслова падагнала, бо падсвядома гэтыя падзеі даўно ўжо маюць для гэтай зямлі аднолькавыя наступствы.

Увесь час дзіўлюся наколькі заможная існая дзяржава: спачатку дае грошы на брукаванне ходнікаў ці вакзальных платформаў, а затым вырашае зняць гэтыя бетонныя пліткі ды пракласці трубаправод, каб зверху пакласці ўжо новы брук. Цікава хто гэта ў горадзе лабіруе інтарэсы плітачна-заборнай, а яшчэ асфальтавай мафіі? У Нарвегіі, да прыкладу, асфальт кладзецца з гарантыяй на 50 гадоў. У нас жа тэхналогіі свае, самаробныя: у асфальт, пэўна, адмыслова кладуць нейкія рэчывы, што яго тэрмінова разбураюць ці памягчаюць. Па каляіне, мусіць, ехаць куды прасцей—збочваць не трэба.

Вось і выбары тут праводзяць па наезджанай каляіне: адна цэлая тры сотыя кандыдата на адзін выбарчы участак, правераныя чальцы ў выбарчых камісіях, шалёнае датэрміновае галасаванне, загадзя размеркаваныя вынікі і назіральнікі на адлегласці, што не дае магчымасці дакладна бачыць працэс падліку галасоў.

Калі прасачыць за тым, што для ўлады з'яўляецца прыярытэтным, то вымалёўваецца такая сітуацыя. Выбары па-беларуску—аснова стабільнасці. Улада і палітычна-сацыяльнае ўладкаванне жыцця—рэчы нязменныя. У гэтым пераканана і ўлада, і вялікая частка народу. На парушэнне правоў чалавека, на існаванне пячорнага выбарчага заканадаўства, на навакольны маральна-культурны прымітывізм ўвагі ніхто не звяртае.

Паказушнасць—другі кіт на, якім грунтуецца тутэйшая рэчаіснасць. Сюды можна ўлучыць жытловае будаўніцтва, рэканструкцыю і аднаўленне культавых і культурных аб'ектаў і г.д..

Амаль поўная працоўная занятасць пры сярэднім заробку ў 700 тыс. руб.—яшчэ адно супервынаходніцтва існага рэжыму. Невялікія грошы змушаюць людзей адчуваць залежнасць ад існае сістэмы, якая праз кантрактную сістэму, выпрацаваныя псеўдаўстаноўкі і стэрэатыпы паводзін уплывае на чалавека, які прызвычайваецца слепа падпарадкоўвацца, не задумваючыся над мэтазгоднасцю і маральнасцю ўсяго, што адбываецца навокал.

Можна было б прывесці яшчэ шэраг важных, дзейсных рычагоў уплыву на грамадства і асобнага чалавека, але гэта не дадасць нічога новага да ўжо сказанага. Сістэма працуе на псеўдастабільнасць. Чаму псеўда? Ды таму, што ўся гэтая сістэма паразітарная па сваёй сутнасці. З верху да нізу ў ёй адсутнічае аснова любога нармальнага жыцця—канкурэнцыя. Сродкі масавай інфармацыі манапалізаваныя, парламентары і прэзідэнт дуюць у адну дудку, грамадскія стасункі ў асноўным фармалізаваныя. Пры такой адзінадушнасці хутка можна дакаціцца да поўнай разумовай інфантыльнасці ды дэградацыі.

Уладзе чамусьці падаецца, што калі не казаць пра ахвяраў сталінізму, пра галадамор, не пераглядаць выпрацаваных стэрэатыпаў пра вайну, не гаварыць пра апазіцыю і тых, хто яе падтрымлівае, дый яшчэ не казаць шмат пра што, то ўсё рассасецца само сабой. Аднак гэта ж не так. За прывабнасцю знешняга фасада ўлада імкнецца схаваць глыбінныя праблемы нашага нацыянальнага існавання. Яна наіўна мяркуе, што створанае ёю на вякі.

Замест таго, каб у 1994 годе прыняць пошукава-варыятыўнае стаўленне да жыцця, як да вечна зменлівай існасці, тутэйшае жыхарства пайшло па наезжанай каляіне савецкіх уяўленняў, дзе дзяржаве дадзена права думаць і прымаць рашэнні за ўсе існыя грамадскія станы.

Рэдактар.

ВЫБАРЧЫ ФАРС АДБЫЎСЯ

Напярэдадні выбараў інтэр'в'ю раённай газеце " Жыццё Прыдзвіння" дала загадчыца раённага аддзела адукацыі, па сумяшчэнні, старшыня раённай выбарчай камісіі Вольга Разанава. Для дакладнага разумення той сітуацыі, да якой мы дакаціліся, будзе досыць цікава прааналізаваць змест пытанняў і адказаў на іх.

Шэсць пытанняў, зададзеных карэспандэнткай, сведчаць пра ўзровень цікавасці і важнасці выбараў як для грамадскасці, так і для дзяржавы. Шэсць фармальных пытанняў—шэсць фармальных адказаў. Датэрміновыя выбары, адпаведнасць выбарчай кампаніі заканадаўству, наяўнасць назіральнікаў, лібералізацыя заканадаўства, забаўляльная праграма як настальгія па саўку, зычэнні выбарцам—своеасаблівы мінімальны кошык уяўленняў тутэйшай ідэалагічна-кіроўнай групоўкі пра гэткую з'яву, як выбары.

Ужо адно тое, што кіраваць кампаніяй даручылі загадчыцы аддзела адукацыі, сведчыць хаця б пра дзве рэчы: па-першае, з усёй раённай вертыкалі—гэта, відаць, самы незаняты чыноўнік; па- другое, гэта можна разумець, як паблажлівае стаўленне кіраўніцтва раёну да адукацыйнай сферы. Маўляў, у цацкі людзі гуляюць, а мы ў той час эканоміку ўздымаем.

Ну, а калі ўжо зусім без іроніі, то самая галоўная прычына гэткага прызначэння хаваецца ў тым, што падначаленыя Вольгі Разанавай знаходзяцца ці ні ў кожнай выбарчай камісіі. Дарэчы, ужо адно тое, што настаўнікі з такой лёгкасцю ідуць у склад участковых камісій, сведчыць пра прадажнасць і несумленнасць настаўніцтва, як грамадскай супольнасці. Калі ў краіне адсутнічае дэмакратыя, дык настаўнік, калі ён настаўнік, мусіць сведчыць пра гэта, як апосталы некалі сведчалі Хрыстову праўду. Інакш—гэта ўжо і не настаўнік, а паслугач хлусні і падману.

Прызначэнне В.Разанавай—ёсць прыхаваным ціскам на чальцоў выбарчых камісій. Вось вам і вольныя выбары. Калі яшчэ ўлічыць, што кіраўнікі прадпрыемстваў змушаюць працоўных да датэрміновага галасавання, то ўсё астатнее—справа тэхнікі. Наш жа народ з часоў паншчыны запраграмаваны на падтрымку любой улады, бо " моцная ўлада" ў ягоным успрыманні—гарантыя хоць якой стабільнасці. Не скажу, праўда, як для народа, а для дзяржавы датэрміновае галасаванне—адназначна аснова стабільнасці.

Адказваючы на другое пытанне В. Разанава засведчыла, што " ніякіх нараканняў адносна дзейнасці камісій не паступала".

Дый і ад каго яны маглі паступіць. У якасці назіральнікаў выступілі: 31 грамадзянін, "дэлігаваны" ад працоўных калектываў, 32 ад БРСМ ды ажно цэлы адзін назіральнік ад Камуністычнай партыі Беларусі. Гэта ж трэба было дакаціцца, што ў раёне няма хаця б з дзесятак-другі розных пардый. Жарт, канечне, але апалітычнасць, што пануе наўкола, сведчыць усяго толькі пра катастрафічную ступень дэградацыі тутэйшага грамадства.Так што адказваючы на трэцяе пытанне, В. Разанава нават і не падумала пра паталагічнасць гэткага псеўданазірання, калі ўлада кантралюе сама сябе праз дэлегаваных ёю ж людзей.

Ну, і, канечне, не магла не адзначыць такая абазнаная асоба ў выбарчых перапетыях, як Вольга Іванаўна, пра станоўчыя, амаль рэвалюцыйныя змены ў заканадаўстве паводле Пастановы № 24 Цэнтральнай камісіі па выбарах. Аказваецца цяпер можна прагаласаваць не толькі па пашпарце, але і па іншых дакументах, абы фотаздымак быў.

Адказ на пятае пытанне засведчыў, што ва ўяўленні В. Разанавай і ўсяе вертыкалі, выбары—факт не столькі палітычна-статыстычны, колькі ідэалагічна-святочна-паказальны. Выбары мусяць засведчыць радасць насельніцтва з нагоды нязменнасці існае ўлады. І гэтая радасць мусіць быць арганізаваная праз выступы творчых калектываў, якія спяюць ідэалагічна правільныя спевы і станчаць ідэалагічна выверанныя танцы. А тых, хто ўпершыню прыйшоў на выбары, адзначаць сімвалічным падарункам далучнасці да кагорты адзінадушных.

І ўдумайцеся ў апошні адказ старшыні раённай выбарчай камісіі наконт пажадання выбарнікам: зычу " прыняць актыўны ўдзел у галасаванні...зрабіць правільны выбар". Хутчэй гэткае зычэнне пасуе самой Разанавай, чым выбарцам, асабліва арыгінальна наконт " правільнага выбара". Як можна памыліцца, калі ў спісах адзін кандыдат. Ну, відаць, гэта проста прыхаваны намёк на тое, каб не галасавалі " супраць усіх" і не псавалі бюлютэняў. Своеасаблівая перастрахоўка.

Пасля завяршэння выбараў можна з упэўненасцю сказаць, што шэсць адказаў на шэсць пытанняў зрабілі сваю справу: 98 % выбарнікаў раёну(2 вынік па вобласці) прынялі ўдзел у выбарах. 38% з іх прагаласавалі датэрмінова. Урэшце абралі 2 дэпутаты ў абласны Савет, 40- у раённы, 160-у сельскія Саветы.

Сказаць, што ў выніку гэткай выбарчай кампаніі і выбараў перамогу атрымаў беларускі народ, я, на жаль, не магу. Там дзе няма альтэрнатывы, дзе адсутнічае дух барацьбы і спаборніцтва паміж кандыдатамі, дзе выбарамі займаецца ўлада, а не палітычныя партыі і грамадскасць, няма і не можа быць шчасця ды і нармальнага, здаровага чалавечага жыццяўладкавання. І мне пасапраўднаму шкада гэты народ, які змушаюць удзельнічаць у фарсе, а ён моўчкі згаджаецца з гэтым.

Якаў Дрозд.

"Покліч волі" ў Інтэрнэце

Шаноўны чытач! Раней чым з паштовай скрыні вы можаце чытаць нашу газету ў Інтэрнэце. Газета размешчана для спампавання на сайце http://haradok.belarda.org/ у раздзеле "Незалежныя выданні" на старонцы газеты "Покліч волі".

Вынікі апошняга апытання на сайце http://haradok.belarda.org/
Ці магчымы на Беларусі кіргізкі сцэнар?

Не 46%
Магчыма, калі ўзрасце жабрацтва 22%
Магчыма, калі ўзрасце карупцыя 18%
Магчыма, калі ўзмацніцца апазіцыя 4%
Магчыма, калі пажадае Расія 10%

АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Покліч волі» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.***
- ***Рэдакцыя «Покліч волі» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Покліч волі».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

7 СЛАВУТАСЦЯЎ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

В. Вялікія Лёццы. Сядзібны дом Адамавых.

ЖАЛОБНЫ МІТЫНГ

26 красавіка ў Віцебску на Успенскай горцы святаром быў адслужаны малебен з нагоды 24-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Прысутнічала больш за 20 чалавек, сярод якіх некалькі удзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі. Да крыжа, усталяванага перад Свята-Успенскім саборам, быў ускладзены жалобны вянок у памяць ахвяраў трагедыі. За тым, як разгортваліся падзеі, пільна сачылі з дзясятак людзей у цывільным, а на нейкай адлегласці бавіўся цэлы аўтобус міліцыянтаў.

26 красавіка 1986 году на тэрыторыі СССР адбылася вялікая трагедыя, рэха якой чуваць і дагэтуль. Гэтая падзея чорнай мяжой падзяліла найноўшую гісторыю Беларусі на два перыяды – да катастрофы і пасьля. На жаль, грамадскасць усё радзей узгадвае пра гэтую падзею, як бы саромеючыся злачыннага стаўлення дзяржавы да праблемаў выкліканых выбухам на станцыі. Мне падаецца, для гэтага рэжыму як не было Курапатаў і Катыні, так няма і Чарнобыля. Беларусь—адзіная дзяржава, у якой існуюць нормы на ўтрыманне радыяцыі ў прадуктах харчавання.

Як і савецкае кіраўніцтва, сённяшняя ўлада краіны хавае ад свайго народу інфармацыю аб наступствах катастрофы. Сотні пажарнікаў і добраахвотнікаў прынялі ўдзел у тушэньні пажару на АЭС, не ведаючы, што ў гэты час яны атрымліваюць смяротную дозу апраменьвання, і неўзабаве сканалі пакутлівай смерцю ад прамянёвай хваробы. А зараз народ працягвае жыць і спажываць прадукты харчавання атрыманыя на забруджанай тэрыторыі, падвяргаючыся ўздзеянню радыяцыі і нават не ведаючы пра гэта.

Ян Сведка.

НАШЫ ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ

Пагоскі Аляксандр Фаміч

(9.3.1816-7.9.1874 гг.)

Педагог, пісьменнік, выдавец. Паходзіў з дваран Віцебскай губерніі. З маленства выхоўваўся ў арыстакратычнай сям'і былога магілёўскага губернатара І.Маркава. У 1829 паступіў у Вышэйшае вучылішча ў Пецярбургу, якое, аднак, у хуткім часе пакінуў. 16-гадовым юнаком быў залічаны на вайсковую службу. У 1843 выйшаў у адстаўку ў чыне падпаручніка і нейкі час працаваў камісіянерам у Дэпартаменце карабельных лясоў. Частыя службовыя раз'езды па Расіі далі яму магчымасць блізка пазнаёміцца з побытам рускага народа і назапасіць багаты матэрыял для творчай работы. Пасля скасавання дэпартамента Пагоскі ў 1859 звольнены з пасады і цалкам аддаўся літаратурнай і асветніцкай дзейнасці. Яшчэ ў 1858 яго запрасілі для выдання часопіса «Солдатская беседа», які ён рэдагаваў да 1863. У 1862 Пагоскі распачаў выданне часопіса «Народная беседа». Невялічкага фармату кніжкі часопіса апрача белетрыстычных твораў змяшчалі інфармацыю пра сучасныя падзеі грамадскага жыцця, афіцыйную хроніку і г.д. - даступнае народнаму разуменню чытанне. Сярод супрацоўнікаў часопіса і яго аўтараў былі А.М.Майкаў, М.А.Някрасаў, А.Сляпцоў і інш. пісьменнікі. У 1867 П. заснаваў новы часопіс - «Досуг и дело», які меў значны поспех (выдаваўся і пасля смерці рэдактара). У сваіх творах, напісаных жывой народнай мовай, праводзіў думку пра неабходнасць пісьменнасці і адукацыі для простага чалавека. Асвету ён лічыў галоўным звяном, што звязвае ўсіх людзей. Аўтар п'ес «Няздольны чалавек», «Лёгкая дабаўка», «Чаму быць, таго не мінуць» і інш. Поўны збор твораў Пагоскіна выйшаў у 4 тамах у 1899-1901.

ЗАГІНУЎ ПРАЦАЎНІК

У Віцебскім раёне ў вёсцы Янавічы пры будаўніцтве зернясховішча адбылося надзвычайнае здарэнне. Загінуў працоўны.

Падчас правядзення будаўнічых прац на тэрыторыі зернясховішча звалілася загараджальная пліта з бетонавых блокаў і прыціснула сабой працоўнага 1957 гады нараджэння. Ад атрыманых целавых пашкоджанняў мужчына сканаў на месцы.

Праверку ў частцы парушэння правіл аховы працы праводзіць пракуратура Віцебскага раёна.

Ян Сведка.

Бел-чырвона-белы сцяг на Кастрычніцкім судзе Віцебска

Суд над Сяргеем Каваленкам за вывешванне сцяга на навагодняй ёлцы, які мусіў быў пачацца 20 красавіка, перанесены, бо актывіст апазіцыі затрыманы за вывешванне бел-чырвона-белага сцяга над ганкам суда.

Каля 10:30, побач з будынкам Кастрычнікага суда ў Віцебску сабралася прыблізна 20 чалавек, спадар Каваленка стаў размахваць бел-чырвона-белым сцягам над галавой і голасна выгукваць: "Жыве Беларусь! Сёння мяне будуць судзіць за гэты сцяг!". Потым, на некаторы час, сцяг быў замацаваны ў адмысловае дзяржанне над ганкам будынка суда.Міліцыянер, які ахоўваў суд, прасіў Сяргея Каваленку спыніць імправізаванае выступленне, але той зноў узняў сцяг над галавой. Толькі калі прысутных запрасілі ў залу суда апзіцыянер акуратна згарнуў і схаваў сцяг. Аднак суда не адбылося — ужо ў будынку суда Каваленку паведамілі, што ён затрыманы за парушэнне грамадскага парадку. Яго пасадзілі ў мікрааўтобус і адвезлі ў Кастрычніцкі РАУС. Пад час гэтых падзей група маладзёнаў у цывільным актыўна першакаджала працы прэсы, адзін з іх фіксаваў падзеі на відэакамеру. Прысутныя Барыс Хамайда і Ян Таўпыга ўступілі з невядомымі ў спрэчку і катэгарычна запатрабавалі спыніць супрацьзаконную дзейнасць.Калі Сяргей Каваленка знаходзіўся ў пастарунку, нехта вывесіў на будынку Кастрычніцкага РАУС бел-чырвона-белы сьцяг. Пры гэтым былі затрыманыя журналіст "Белсату" Уладзімер Стараверaў і Павел Севярынец. Пазней, за "няправільны пераход дарогі" быў затрыманы Барыс Хамайда.

Ян Сведка.

7 сутак арышту за бел-чырвона-белы сцяг

21 красавіка ў Віцебску адбыўся суд над сябрам Кансэрватыўна-хрысціянскай партыі БНФ Сяргем Каваленкам. За ўчорашнюю акцыю з бел-чырвона-белым сцягам каля Кастрычніцкага райсуду суддзя Іна Грабоўская прысудзіла яму сем сутак арышту.

Каваленку абвінавацілі ў правядзенні несанкцыянаванай акцыі паводле артыкулу адміністрацыйнага за арганізацыю і паўторны ўдзел ў несанкцыянаваных акцыях.

Цяпер распачаўся судовы працэс на ягоным братам Віталем Каваленкам, якога таксама ўчора затрымалі і вінавацяць у тым, што ён спраўляў патрэбу ў неналежным месцы.

Сяргея Каваленку ўчора мусілі судзіць па крымінальнай справе за вывешванне бел-чырвона-белага сцяга на гарадской навагодняй ёлцы ў Віцебску. Суд па гэтай справе адклалі на 12-га траўня, пасля таго, як Сяргей Каваленка разгарнуў бел-чырвона-белы сцяг на ганку судовага будынку, за што і быў затрыманы.

Брат Сяргея Каваленкі Віталь арыштаваны судом на 6 сутак. Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі.

Ян Сведка.

ДАВЕР ПАДРЫВАЕЦЦА

Арганізатары «Славянскага базару» павінны аўтарам 200 мільёнаў

Арганізатары XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» да гэтага часу не выплацілі аўтарскае ўзнагароджанне беларускім і замежным аўтарам. Пра гэта паведаміў сёння на прэс-канферэнцыі начальнік цэнтра па калектыўнымкіраваньнімаёмаснымі правамі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Аляксей Бічурін.

Не выплачана больш за Br200 млн. аўтарскага ўзнагароджання. Да вырашэння праблемы разам з Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці падключыліся і зацікаўленыя дзяржаўныя органы. Прапрацоўваюцца магчымыя шляхі вырашэння праблемнага пытання, у тым ліку і з тым, каб захаваць давер з боку аўтарскай супольнасці.

У 2009 годзе ў Беларусі выплаты аўтарскіх узнагарод беларускім аўтарам выраслі на 13% у параўнанні з 2008 годам, выплаты з-за мяжы павялічыліся на 22%. У той жа час Беларусь па зборы аўтарскага ўзнагароджання значна адстае ад іншых краін, у тым ліку супастаўных па колькасці насельніцтва і памеры, а таксама ўзроўню эканамічнага развіцця. Ліквідаваць такую дыспрапорцыі магчыма, у тым ліку, з дапамогай змены нацыянальнага заканадаўства.

ДА КУЛЬТУРЫ ЖЫЦЦЯ ШЧЭ ДАЛЁКА

У Віцебску быў праведзены рэйд па водаахоўнай зон на прадмет выканання заканадаўства аб рэжыме іх зместу.

У ім прымалі ўдзел памочнік пракурора Чыгуначнага раёна Наталля Анатольеўна Мальцава, галоўны дзяржаўны інспектар Віцебскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Мікалай Сяргеевіч Каплан і галоўны спецыяліст Віцебскай гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Валянціна Аляксееўна Сіняковым.

Практычна ва ўсіх месцах, якія абследавала камісія, былі выяўленыя тыя ці іншыя парушэнні. Самае распаўсюджанае з іх - прылада несанкцыянаваных звалак. Жыхары аддаленых раёнаў не чакаюць прыезду машыны, якая збірае смецце, і выкідваюць усё непатрэбнае на схілы рэк, у яры. Таксама паступаюць і супрацоўнікі прадпрыемстваў, размешчаных на ўскраінах горада. Таму, атрымліваецца, што на тэрыторыі саміх прадпрыемстваў узорная чысціня, а за варотамі - смецце і бруд. Шмат смецця на схілах рэк пакідаюць пасля сябе людзі, якія прыехалі адпачыць на прыродзе. А на тэрыторыю каля Віцебскага лесапункта ААТ «Віцебсклес» асноўны смецце прыехала са снегам. Расчышчаючы вуліцы, гарадскія службы вывозілі сюды снег. Паскорылі вясну і заадно зрабілі сметнік.

Сярод іншых парушэнняў - несанкцыянаваныя будынкі ў прыбярэжнай паласе, забруджванне тэрыторыі адходамі нафтапрадуктаў.

Па выніках рэйду пракуратурай раёна ўнесены два прадстаўлення кіраўнікам мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства, узмацненні кантролю за вядзеннем гаспадарчай і іншай дзейнасці ў прыбярэжных палосах, а таксама аб прыцягненні да адказнасці вінаватых службовых асоб.

Вынесена два загады кіраўнікам прадпрыемстваў аб прыняцці неадкладных мер да ліквідацыі парушэньняў заканадаўства. Віцебскай гарадской інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўладальнікам прыватных жылых дамоў выдадзена 22 актузагады, два службовых асобы прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці.

ПОСЛАНИЯ ГЛАВЫ ГОСУДАРСТВА: СЛОВА И ДЕЛА

С ежегодным посланием к Национальному собранию и народу Александр Лукашенко обратится 20 апреля. Накануне мы просмотрели его выступления последних трех лет и сравнили, как реализуются его слова на деле.

Вот лишь некоторые тезисы, которыми ублажал слух своих граждан в ежегодных посланиях президент.

Слово: «Неоспоримым преимуществом нашей модели экономического развития является то, что мы не влезли в долги. Кредит – это капкан, в который попадем даже не мы, а наши дети и внуки. Ни в коем случае нельзя допустить, чтобы кредит превратился в средство давления на нашу страну». (2007 год)

Дело: Тот факт, что наша страна все прочнее садится на кредитную иглу, с каждым годом наращивая темпы заимствований, уже не вызывает ни у кого сомнений. К 2010 году Беларусь успела наскрести по сусекам кредитов на 22 млрд долларов и, судя по всему, не собирается останавливаться на достигнутом. Поменялась и риторика главы государства: в 2009 году он уже заявлял, что, получив международные кредиты, наша страна получила «запас прочности» и ни слова о жизни без долгов как о неоспоримом преимуществе нашей экономической модели.

Слово: «В последнее время, особенно в России многие ёрничают: неужели Лукашенко повезет из Азербайджана, Ирана и Венесуэлы нефть в Беларусь, когда российская выгоднее. Конечно, не повезет». (2007)

Дело: Не прошло и трех лет, как венесуэльская нефть прямиком отправилась в наши края. По железнодорожным путям через Одессу уже побежали первые вагоны с черным золотом. И хоть объемы и экономическая выгода такой сделки выглядят сомнительно, в России уже не ёрничают. Там прямо крутят у виска.

Слово: «Если и будет приватизация, она будет открытой и честной. Никакой номенклатурной, клановой, как я сказал, и недобросовестной приватизации в стране не будет… Объекты будут продаваться только по конкурсу или через аукцион... Конкурировать между собой будут не фамилии или покровители, а бизнес–планы и социальные программы по поддержке трудового коллектива» (2007).

Дело: Насколько честна и прозрачна у нас приватизация, можно пронаблюдать на ряде недавних сделок. Достаточно припомнить продажу лакомого куска в центре Минска, который достался Оману за символическую сумму в 10 млн. долларов. Не менее «темной» оказалась и история с продажей госпакета акций СП МЦС (Velcom). Оглашения суммы вырученных средств пресса не могла добиться очень долго. В той же череде стоит и покупка швейцарской компанией Franck Muller часового завода «Луч»… Кстати, относительно последнего, слова тоже несколько разошлись с делом.

Слово: «Но главная задача здесь еще состоит и в том, чтобы сохранить это производство в стране. Оно исторически принадлежит нашей стране. Точно так по часовому заводу. Не знаю, чего там ждут и правительство и Павлов. Ждут, когда я приеду на часовой завод, губят его и дальше, некоторые говорят, давайте его закроем. Людей трудоустроим – не проблема. Вопрос не в этом – можно и МТЗ закрыть, и МАЗ закрыть. Так а с чем мы останемся? Это тоже наш брэнд. Сегодня часы, оказывается, в мире выпускают меньше стран, чем самолеты. Это высочайший уровень технологий».

Дело: Чем закончилось сохранение «брэнда», всем известно. Завод продали швейцарцам за 12,41 миллиона долларов. Эксперты назвали эту сделку полным абсурдом и предположили, что она нужна была только для того, чтобы прикрыть какие-то другие, которые не афишируются.

Слово: «С 1 апреля (2009 года – «С») в убыток работать преступно. Работа в убыток — это завтрашняя катастрофа. То же касается и работы на склад… Мы будем на корню пресекать попытки иждивенческих настроений у хозяйствующих субъектов».

Дело: На 1 февраля складские запасы составили 75,3%. При этом рост запасов зафиксирован во всех отраслях белорусской промышленности. С чистым убытком на конец 2009 года сработало каждое пятое предприятие — 18,6%. Сумма убытка составила 785,9 млрд рублей, или в 3,5 раза больше, чем в аналогичный период прошлого года. В общем, на лицо преступный замысел.

Слово: «С нынешнего года мы принципиально изменим подходы к оценке работы сельхозпредприятий. Сейте то, что будет приносить прибыль. Но на государственные дотации не рассчитывайте».

Дело: Слова о сокращении дотаций сельскому хозяйству звучат из уст президента с завидным постоянством. Между тем, по словам вице-премьера Ивана Бамбизы, только в 2009 году на аграрный сектор из бюджетов всех уровней было направлено 4,6 трлн рублей, что на 30% выше уровня 2008 года. Вместе с тем, несмотря на такую поддержку, рентабельности в сельхозорганизациях снизилась до 14,2% против 18,7% в предыдущем году, в том числе от реализации продукции — 4,2% против 6,3%. Это при том, что планы стояли амбициозные — обеспечить уровень рентабельности сельхозпроизводства не ниже 22-25%. Снизилась также чистая прибыль предприятий сельского хозяйства. Она составила 1,4 трлн рублей, или 86% к уровню 2008 года.

Слово: «Налоги призваны стимулировать плательщиков к легальной уплате налогов и сборов. Схема налогов должна быть простой и понятной» (2008 год).

Дело: Казалось бы, некоторые подвижки в этой области были сделаны. Однако в ноябре 2009 года Всемирный банк, Международная финансовая корпорация и PricewaterhouseCoopers опубликовали шестое ежегодное исследование «Уплата налогов 2010. Международный обзор». В рейтинге по простоте уплаты налогов Беларусь в очередной раз заняла последнее 183-е место.

Слово: «Основной вопрос, который будоражит наши умы: кто же будет строить станцию в Беларуси. Этот вопрос в кулуарах решаться не будет. Это будет открытый конкурс. Конечно, нам не хотелось бы – я уже послу России об этом говорил, — чтобы мы складывали яйца в одну корзину. Мы зависим и так по другим видам энергии от России, не хотелось бы зависеть и в строительстве АЭС только от Российской Федерации. Это я говорю честно. Мы хотели бы, чтобы АЭС построили, может быть, другие» (2007).

Дело: Как ни «противился» президент, а «честный» конкурс выиграли именно россияне. «Складированию яиц» существенно поспособствовал обещанный Россией под строительство АЭС кредит. А конкуренты отдыхают: «Слушайте, посмешище! Мы им предлагаем за блок почти два миллиарда долларов, а они перед нами ставят условия, какое у вас будет предвыборное законодательство...», — возмущался президент.

Слово: «Задача правительства, всех республиканских и местных органов управления — даже в условиях роста цен на энергоносители сохранить в этом году (2007-м – «С») положительную динамику снижения темпов инфляции и по итогам года выйти на целевые параметры, предусмотренные в прогнозе социально–экономического развития страны, — 6—8%».

Дело: Тогда по итогам 2007 года официальный рост потребительских цен составил 12,1%, или в 1,51 раза больше верхнего предела. Больше столь амбициозных задач президент не ставил.

Слово: «Сергей Сергеевич (Сидорский – «С»), надо возвращаться к требованию повышения заработной платы. Другого пути нет. На конец пятилетки нам надо заработную плату довести, боюсь говорить, до 700 долларов, никуда не денемся. 500 долларов будет мало. Надо 700 – среднюю зарплату по стране. Тогда мы сможем удержать стабильность в нашем обществе». (2008)

Дело: Похоже, не видать нам стабильности как своих ушей. Нынешняя средняя зарплата белоруса не то, что до 700, до 500 вряд ли дотянет. Во всяком случае, к концу 2010 года. Напомним, что в феврале начисленная средняя зарплата составила 1.016.393 рубля, или 346 долларов по текущему курсу. Хотя еще в конце 2008 года она равнялась 456 долларам США.

Слово: «Кто эти шесть человек, которых Запад назвал политическими заключенными? Двое осуждены за незаконное предпринимательство и неуплату налогов. Двое за хулиганство, один за незаконную деятельность и еще один за призыв к деятельности, направленной против страны... Мы приняли решение, что тему закрываем. Пятеро на свободе — шестой (видимо, президент имел в виду Александра Козулина — «С») отказался. Какие к нам претензии?»

